# Гадзінкі аб Беззаганным Пачацці Найсвяцейшай Панны Марыі

**Ютрань**

Пачынайце, вусны нашы, Маці праслаўляці,
пачынайце гімн славы радасна спяваці.
    Будзь нам, Маці міласэрна, сталай дапамогай,
    барані ад спакусаў і шатана злога.
Хвалім Бога ў Тройцы вечнай і Айца, і Сына,
Духа, роўнага ў Боства, на вякі, няспынна.
    Як была пашана Пану, хай заўсёды будзе —
    на зямлі няхай вечна Бога славяць людзі.

**Гімн**

Радуйся, о Пані свету, неба Валадарка,
Ты светлая, як зорка, што ўзышла над ранкам.
    Радуйся, поўная ласкі, яснасць незямная,
    ратуй нас ад шатана, Маці Прасвятая.
Пані, Цябе сам Бог Моцны, Творца чалавека,
абраў за Маці Слова, што жыло спрадвеку.
    Слова, што ўвесь свет стварыла, неба над зямлёю,
    паіла ўсё жывое чыстаю вадою.
Бог Цябе выбраў Нявестай і ўчыніў святою,
Адамаў грэх моц страціў, Пані, прад Табою.

Кантар: **Выбраў Яе Бог і па-над усім узвялічыў.**
Усе: **І абраў Яе, быццам дом, у якім сам прабывае.**
К.: **Пані, выслухай малітвы нашы.**
Усе: **І просьбы нашы няхай да Цябе дойдуць.**

К.: **Молімся: Святая Марыя, Валадарка неба, Маці Пана нашага Езуса Хрыста і Пані свету, якая нікога не пакідаеш і нікім не пагарджаеш, узглянь на нас, о наша Пані, ласкавым позіркам Сваёй міласэрнасці, і выпрасі нам у Свайго Сына дараванне нашых правінаў, каб мы, хто цяпер над Тваім святым Беззаганным Зачаццем пабожным сэрцам разважае, маглі атрымаць у небе ўзнагароду вечнага жыцця; няхай жа нам так учыніць Табою народжаны Твой Сын, а наш Пан Езус Хрыстус, які з Айцом і Святым Духам жыве і валадарыць, у Тройцы Святой Адзіны Бог на вякі вечныя. Амэн.**

К.: **Пані, выслухай малітвы нашы.**
Усе: **І просьбы нашы няхай да Цябе дойдуць.**
К.: **Праслаўляйма Пана.**
Усе: **Богу хвала.**

К.: **А душы верных памерлых праз Божую міласэрнасць няхай спачываюць у супакоі вечным.**

Усе: **Амэн.**

### Прыма

Будзь нам, Маці міласэрна, <u>ста</u>лай дапамогай,
барані ад спа<u>ку</u>саў і шатана злога.
Хвалім Бога ў Тройцы вечнай <u>і</u> Айца, і Сына,
Духа, роўнага ў <u>Бост</u>ве, на вякі, няспынна.
Як была пашана Пану, <u>хай</u> заўсёды будзе —
на зямлі няхай <u>веч</u>на Бога славяць людзі.

### Гімн

Радуйся, мудрая Панна, Мудрасці дом Божай,
які цудоўна здобяць сем калон прыгожых.
Ад сапсаванасці свету Богам захавана,
Ты ўжо была святою ў лоне маці – Ганны.
Новая зорка Якуба і Анёлаў Пані,
жывых праўдзіва Маці, сіла у змаганні.
Грозная Ты для шатанаў, збаў ад іх напасці,
Ты прыстань хрысціянаў ў горы і няшчасці.

К.: **Сам Яе стварыў у Святым Духу.**

Усе: **І над справамі рук Сваіх Яе ўзвялічыў.**

К.: **Пані, выслухай малітвы нашы.**

Усе: **І просьбы нашы няхай да Цябе дойдуць.**

К.: ***Молімся: Святая Марыя, Валадарка неба...***

### Тэрцыя

*Будзь нам, Маці міласэрна...* — (як у Прыме)

### Гімн

Радуйся, Трон Саламонаў, Арка Запавету,
Вясёлка з фарбаў райскіх Ўладара сусвету.
Ты, нібы куст Майсееў, Богам палымнееш,
як посах Ааронаў, Езусам квітнееш.
Божая Брама замкнёна, мёду пласт Самсона,
Руно, што мацавала мужнасць Гедыёна.
Сын Твой Святы і Адзіны Бог праўдзівы з неба,
Цябе ўсцярог ад грэху нашай маці Евы.
Толькі Цябе, Маці Слова, Бог абраў спрадвеку,
каб Ты была нявіннай і без плямы грэху.

К.: **Я жыву на вышынях.**

Усе: **А трон мой у слупе аблокаў.**
К.: **Пані, выслухай малітвы нашы.**
Усе: **І просьбы нашы няхай да Цябе дойдуць.**
К.: ***Молімся: Святая Марыя, Валадарка неба...***

**Сэкста**

*Будзь нам, Маці міласэрна...* — (як у Прыме)

**Гімн**

Радуйся, Тройцы Святыня, Божая Святліца,
святых Анёлаў радасць, чыстасці Капліца.
Ты чысціні Кедр шляхетны, Сад удзячных думак,
цярплівасці Ты Пальма, у журбе ратунак.
О, бласлаўлёная Пані, Ты Зямля святая,
што вольнасці ад грэху дар таемны маеш.
Быццам святы Горад Божы  і на Ўсходзе Брама,
любоўю, светлай ласкай ззяеш, Беззаганна.

К.: **Як лілея паміж церня.**
Усе: **Так і мая ўлюбёная паміж дачок Адама.**
К.: **Пані, выслухай малітвы нашы.**
Усе: **І просьбы нашы няхай да Цябе дойдуць.**
К.: ***Молімся: Святая Марыя, Валадарка неба...***

**Нона**

*Будзь нам, Маці міласэрна...* — (як у Прыме)

**Гімн**

Радуйся, Горад уцёклых, вежа ўзмацавана,
узведзена Давідам, Ты цвярдыня Пана.
Ты пры зачацці любоўю Божай палымнела,
каб праз Цябе моц Злога назаўжды здранцвела.
О, дабрадзейна Жанчына, мужная Юдыта,
о Маці Сына з роду караля Давіда.
Хлебам карміў ўвесь Егіпет Юзаф, сын Рахэлі,
Марыі Сын ад смерці выбавіў свет цэлы.

К.: **Ўся Ты прыгожая, наша Пані.**
Усе: **І плямы першароднай не было ў Табе ніколі.**
К.: **Пані, выслухай малітвы нашы.**
Усе: **І просьбы нашы няхай да Цябе дойдуць.**
К.: ***Молімся: Святая Марыя, Валадарка неба...***

## Нешпары

*Будзь нам, Маці міласэрна...* — (як у Прыме)

### Гімн

Радуйся, цуд з Габаону, верным дапамога,
Ты Кроў дала і Цела Сыну Пана Бога.
    Каб у смяротнай даліне чалавек не згінуў,
    а годным стаўся неба, славы Херувімаў.
Промнямі Боскага сонца зіхаціць і ззяе
зачатая без грэху, чыстая, святая.
    Кветка між церня-Лілея мужна змея топча,
    як месяц ясны ў поўні, губіць цемру ночы.

К.: **Я ўчыніла, каб на небе ўзыходзіла святло няспынна.**
Усе: **І быццам імгліца ўсю зямлю агарнула.**
К.: **Пані, выслухай малітвы нашы.**
Усе: **І просьбы нашы няхай да Цябе дойдуць.**
К.: ***Молімся: Святая Марыя, Валадарка неба...***

## Камплета (Напрыканцы дня)

Хай жа дасць нам Сын Твой любы ласку навяртання,
хай даруе нам віны, не спашле карання.
*Будзь нам, Маці міласэрна...* — (як у Прыме)

### Гімн

Радуйся, о Маці ласкі і заўсёды Дзева.
Стаіш ля трону Бога, неба Каралева.
    Пераўзышла Анёлаў чыстасцю Сваёю,
    вянком дванаццаць зорак  свецяць над Табою.
Аздараўленне для хворых, ясна Зорка мора,
усіх, што тонуць, прыстань і надзея ў горы.
    Брама адкрытая ў Неба, грэшных абарона,
    вядзі нас на сустрэчу з Богам на Сыёне.

К.: **Тваё імя, о Марыя, як алей духмяны..**
Усе: **А Твае слугі моцна Цябе ўзлюбілі.**
К.: **Пані, выслухай малітвы нашы.**
Усе: **І просьбы нашы няхай да Цябе дойдуць.**
К.: ***Молімся: Святая Марыя, Валадарка неба...***

## Ахвяраванне Гадзінак

Пані, прымі спеў гадзінак, што Табе мы ўзносім,
з паклонам і пакорай дапамогі просім.
Шляхам вядзі нас збаўленным, памажы ў патрэбе
не пакідай пры смерці, дай нам быць у небе.

**Антыфона**

Кветка чыстая, якую не крануў грэх першародны
і якую не заплямiў бруд учынку злога.
.

К.: **Пры сваім Зачацці, о Пані, Ты была беззаганнай..**
Усе: **Маліся за нас да Бога Айца, бо Ягонага Ты Сына нарадзіла.**

К.: **Молімся: Божа, Ты праз Беззаганнае Зачацце Найсвяцейшай Панны падрыхтаваў свайму Сыну годнае прабыванне ў нявінным улонні, і праз заслугі будучай смерці Хрыста Ты захаваў Яе ад усялякай правіны. Дазволь нам праз Яе заступніцтва дайсці да Цябе без граху. Праз Езуса Хрыста, Пана нашага, які з Табой жыве і валадарыць у еднасці Духа святога, Бог праз усе вякі вечныя.**

Усе: **Амэн.**